Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 236 (305) ПЯТНІЦА 11 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ ПРОФСАЮЗНЫХ ОРГАНАЎ

У бліжэйшыя дні пачынаюцца і на працягу кастрычніка—лістапада павінны быць праведзены справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў, а таксама цэхавых камітэтаў і арганізатараў профсаюзных груп. Гэтыя выбары будуць мець вялікае значэнне для далейшага паляпшэння ўсёй работы совецкіх профсаюзаў — самых масавых арганізацый рабочага класа, еднаючых у сваіх радах 25 з паловай мільёнаў чалавек. Справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў, як гаворыцца ў пастанове Прэзідыума ВЦСПС, павінны быць праведзены пад знакам мабілізацыі шырокіх мас членаў профсаюзаў на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абароннай магутнасці Совецкага Саюза, разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху, далейшы рост прадукцыйнасці працы і ўмацаванне соцыялістычнай працоўнай дысцыпліны, на барацьбу за ліквідацыю прагулаў і самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў.

Больш трох месяцаў назад быў ажыццёўлен пераход на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы тыдзень і забаронена самавольнае пакіданне рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў. Гэта мера вялікай дзяржаўнай важнасці, ажыццёўленая па прапанове совецкіх профсаюзаў, была падтрымана многамільённым совецкім народам. Адкрыліся новыя магчымасці для расшырэння вытворчасці, для ўмацавання гаспадарчай і ваеннай магутнасці нашай соцыялістычнай дзяржавы. Барацьба за ажыццяўленне Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня павінна стаць у цэнтры ўвагі нашых профсаюзаў. Яны абавязаны дапамагаць гаспадарчым органам ва ўстанаўленні жалезнай большэвіцкай дысцыпліны ў кожным прадпрыемстве і ўстанове, не даваць спуску дэзарганізатарам вытворчасці, якія наносяць шкоду інтарэсам дзяржавы і народа. Перад профсаюзамі—школай комунізма — устала задача сур'ёзнага ўзмацнення комуністычнага выхавання рабочых і служачых, узмацнення барацьбы з перажыткамі капіталізма ў свядомасці людзей, стварэння атмасферы грамадскай пагарды к лодырам і дармаедам, якія імкнуцца жыць за кошт працы чэсных людзей, за кошт соцыялістычнага грамадства.

Нельга яшчэ сказаць, што нашы профсаюзныя арганізацыі зрабілі ўсё магчымае для паспяховага ажыццяўлення Ўказа ад 26 чэрвеня. Справа не толькі ў тым, што ў першыя тыдні ажыццяўлення Ўказа некаторыя профсаюзныя арганізацыі не садзейнічалі выкрыццю прагульшчыкаў і іх заступнікаў, а часам самі заступаліся за прагульшчыкаў. Вараз такіх выпадкаў становіцца ўсё менш. Справа ў тым, што некаторыя профарганізацыі да гэтага часу яшчэ вядуць вельмі павярхоўную выхаваўчую работу. На многіх шахтах Падмаскоўнага басейна, напрыклад, уся масавая работа звялася да правядзення лятучых мітынгаў, да чытак Указа. Затое надзвычайна мала было зроблена для таго, каб на канкрэтных прыкладах работы шахт, прыкладах, зразумелых і блізкіх кожнаму рабочаму і служачаму, паказаць шкоду, якую наносяць прагулы. Справа, далей, у тым, што многія профсаюзныя арганізацыі да тэтага часу яшчэ слаба дабіваюцца поўнага выкарыстання 8-гадзіннага рабочага дня і 7-дзённага тыдня, павышэння прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску прадукцыі, паляпшэння яе якасці. Часта яшчэ профсаюзныя арганізацыі праходзяць міма прастояў, не дабіваюцца ўстаранення буйных і дробных непаладак, зніжаючых прадукцыйнасць працы.

Вялікую ролю ў барацьбе з гэтымі непаладкамі могуць і павінны адыграць вытворчыя нарады, якім партыя надае вялікае значэнне. Вытворчыя нарады павінны ўскрываць прычыны ўсякага роду непаладак і дапамагаць іх устараненню. Але яшчэ да тэтага часу на многіх прадпрыемствах вытворчыя нарады склікаюцца рэдка, і, што яшчэ горш, каштоўныя прапановы, думкі, ідэі, выказваемыя на гэтых нарадах, далёка не заўсёды праводзяцца ў жыццё. На металургічных прадпрыемствах, напрыклад, частка рабочых яшчэ не выконвае норм выпрацоўкі. Між тым, як выяснілася днямі пры абмеркаванні ў Прэзідыуме ВЦСПС дакладаў цэнтральных камітэтаў профсаюзаў металургаў, на вытворчых нарадах у заводскіх цэхах менш за ўсё талкуюць аб нормах выпрацоўкі, а ставяць на абмеркаванне толькі «агульныя» пытанні.

Новы парадак работы патрабаваў ад профсаюзаў далейшага паляпшэння бытавога абслугоўвання рабочых і служачых. Члены заўкома, мясцкома раней, чым хто-небудзь іншы, павінны клапаціцца аб дзіцячым садзе, аб дзіцячых яслях. Яны павінны таксама клапаціцца аб рабоце сталовых, аб будаўніцтве і рамонце жылля, аб медыцынскім абслугоўванні рабочых і служачых.

Адбыўшыйся ў ліпені X пленум ВЦСПС абмяркоўваў пытанне аб устараненні некаторых недахопаў у профсаюзным апараце і паляпшэнні работы профсаюзных органаў. Недахопы тэтыя былі выкрыты Цэнтральным Камітэтам нашай партыі. Профсаюзныя органы дапусцілі разбуханне платнага апарата ва ўрон выкарыстання ініцыятывы і самадзейнасці членаў профсаюзаў. Платны апарат цяпер рэзка скарочан. «Аднак, — як указваў сакратар ВЦСПС тав. Швернік,—было-б памылкова думаць, што скарачэннем платнага апарата вырашаецца пытанне аб устараненні маючыхся недахопаў у рабоце профсаюзаў. Скарачэнне платнага апарата павінна суправаджацца змяненнем метадаў работы профсаюзаў знізу даверху. Змяненне метадаў работы азначае перш за ўсё тое, што профсаюзныя органы павінны як ніколі прыцягнуць ва ўсе галіны профсаюзнай работы шырокія масы членаў профсаюза». Кожны рабочы і служачы павінен быць актыўным дзеячом сваёй профарганізацыі.

Пасля X пленума ВЦСПС многія профарганізацыі, скараціўшы штаты, шырока абапіраючыся на актыў, здолелі палепшыць сваю работу. Побач з гэтым ёсць многа выпадкаў, калі профсаюзныя арганізацыі скарачэнне штатаў зрабілі, а актывістаў да справы не прыцягвалі.

Выканаць рашэнні X пленума ВЦСПС—значыць не проста скараціць разбухшыя штаты, а дабіцца, каб кожная профсаюзная арганізацыя, спартыўнае таварыства на аснове самадзейнасці сталі працаваць лепш чым раней.

Справаздачныя і выбарчыя сходы членаў саюзаў падвядуць першыя вынікі перабудовы профсаюзнай работы пасля X пленума ВЦСПС, адзначаць дасягнутыя рэзультаты і на аснове большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ўскрыюць маючыяся недахопы. Справаздачы і выбары павінны садзейнічаць уцягненню новых мільёнаў рабочых і служачых у актыўную грамадскую дзейнасць. Трэба выбраць у састаў фабзаўмясцкомаў лепшых рабочых, інтэлігентаў, служачых — партыйных і непартыйных большэвікоў, здольных падняць узровень усёй профсаюзнай работы, здольных ажыццявіць задачы, пастаўленыя перад профсаюзамі партыяй Леніна—Сталіна.

(Скарочаны перадавы артыкул «Праўды» за 9 кастрычніка).

Аб справаздачах і выбарах фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ВЦСПС

1. У сувязі са скан­чэннем тэрміну паўнамоцтваў фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў правесці ў кастрычніку — лістападзе 1940 года справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў, а таксама цэхавых камітэтаў і арганізатараў профсаюзных груп (профгрупоргаў).

2. Справаздачы і выбары фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў павінны быць праведзены пад знакам мабілізацыі шырокіх мас членаў профсаюзаў на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абароннай магутнасці Совецкага Саюза, разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху, далейшы рост прадукцыйнасці працы і ўмацаванне соцыялістычнай працоўнай дысцыпліны, на барацьбу за ліквідацыю прагулаў і самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў.

3. Абавязаць профсаюзныя органы забяспечыць на справаздачна-выбарчых сходах разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, ускрыццё і ўстараненне недахопаў, якія маюцца ў рабоце профсаюзных органаў, і вылучэнне ў састаў фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў лепшых людзей рабочага класа і совецкай інтэлігенцыі, адданых справе партыі Леніна — Сталіна, здольных на аснове рашэнняў X пленума ВЦСПС хутка ўстараніць недахопы ў профсаюзным апараце і палепшыць работу профсаюзных органаў.

4. Устанавіць, што справаздачы і выбары цэхавых камітэтаў і профгрупоргаў на прадпрыемстве, установе павінны пачынацца не пазней чым праз 5 дзён пасля заканчэння выбараў фабрычна-заводскага ці мясцовага камітэта.

5. Прапанаваць профсаюзным органам праводзіць справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў у нерабочы час па зменах і не дапускаць падмены занятых на рабоце за лік працуючых у другіх зменах.

6. Зацвердзіць тэрміны правядзення справаздач і выбараў фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў па профсаюзах.

7. Зацвердзіць «Інструкцыю аб правядзенні выбараў профсаюзных органаў».

8. Зацвердзіць формы апаратыўнай справаздачнасці аб справаздачах і выбарах фабрычных, заводскіх, мясцовых і цэхавых камітэтаў і профгрупоргаў.

9. Прапанаваць рэдакцыі газеты «Труд», фабрычна-заводскім шматтыражкам і ўсім органам профсаюзнага друку шырока асвятляць справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх, мясцовых і цэхавых камітэтаў і профгрупоргаў.

* * *

Спецыяльная інструкцыя, зацверджаная Прэзідыумам ВЦСПС, устанаўлівае парадак правядзення выбараў профсаюзных органаў.

Выбары профсаюзных органаў праводзяцца закрытым (тайным) галасаваннем. Тайным галасаваннем выбіраюцца фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты, цэхавыя камітэты, арганізатары профсаюзных груп (профгрупоргі), дэлегаты на канферэнцыі і з'езды профсаюзаў, раённыя, гарадскія, абласныя, краявыя, рэспубліканскія і цэнтральныя камітэты профсаюзаў, рэвізійныя камісіі.

Галасаванне спіскам забараняецца. Галасаванне павінна праводзіцца па асобных кандыдатурах, прычым усім членам профсаюзаў забяспечваецца неабмежаванае права адводу і крытыкі кандыдатаў.

Справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх, мясцовых камітэтаў праводзяцца ў нерабочы час на агульных сходах членаў профсаюзаў прадпрыемстваў, устаноў, навучальных устаноў. У асобных выпадках, з дазволу цэнтральных камітэтаў саюзаў, справаздачы і выбары могуць праводзіцца на зменных і цэхавых сходах.

Там, дзе выбары фабрычна-заводскага камітэта праводзяцца на зменных ці цэхавых сходах, пасля абмеркавання справаздачы выбіраюцца адкрытым галасаваннем давераныя асобы (адзін давераны ад 25—50 членаў саюза). Нарада давераных папярэдне намячае кандыдатуры ў састаў фабрычна-заводскага камітэта. Гэтыя кандыдатуры ад імені нарады вылучаюцца на цэхавых ці зменных сходах і абмяркоўваюцца персанальна. Кандыдатуры, вылучаныя на якім-небудзь сходзе паміма прапанаваных нарадай давераных, павінны абмяркоўвацца на ўсіх наступных зменных, цэхавых сходах і ў спіскі для тайнага галасавання ўключаюцца толькі кандыдатуры тых, якіх ракамендуе не менш паловы членаў профсаюза, працуючых на прадпрыемстве.

Сходы лічацца правамоцнымі ў тым выпадку, калі на іх прысутнічае не менш двух трэцей наяўнага саставу членаў профсаюза, працуючых на прадпрыемстве ці ва ўстанове ў перыяд выбараў (за выключэннем хворых, адпускнікоў, знаходзячыхся ў камандыроўках і т. д.).

Абмеркаванне ўсіх кандыдатур вядзецца ў тым парадку, як яны былі запісаны—па меры іх паступлення ў прэзідыум схода, канферэнцыі, з'езда. Кожны ўдзельнік схода можа адвесці любую колькасць кандыдатаў. Па кожнай кандыдатуры можа выказвацца «за» і «супроць» неабмежаваная колькасць членаў профсаюзаў.

Выбранымі ў састаў профсаюзнага органа лічацца кандыдаты, атрымаўшыя большасць галасоў у адносінах да астатніх кандыдатур і больш паловы галасоў прысутнічаючых на сходзе членаў саюза ці дэлегатаў канферэнцыі, з'езда.

Поўнасцю інструкцыя аб правядзенні выбараў профсаюзных органаў апублікавана ў газеце «Труд» за 9 кастрычніка.

Паведамленне ТАСС

У замежным друку і, у прыватнасці, у англійскай газеце «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», у паведамленнях Агенцтва «Юнайтэд Прэс», у грэчаскай газеце «Врадыні» час ад часу паяўляюцца паведамленні аб тым, што, нібыта, Совецкі Ўрад прад'явіў Германскаму Ўраду патрабаванне аб перадачы СССР былых польскіх абласцей, якія адышлі да Германіі, і што па гэтаму пытанню паміж СССР і Германіяй вядуцца, быццам-бы, якіясьці перагаворы.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ўсе гэтыя паведамленні зусім не адпавядаюць сапраўднасці, з'яўляюцца суцэльным вымыслам і адносяцца да катэгорыі плётак, распускаемых з правакацыйнымі мэтамі.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

НАЛЁТЫ ГЕРМАНСКАЙ АВІЯЦЫІ НА АНГЛІЮ

БЕРЛІН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што налёты германскай авіяцыі сёння раніцай мелі сваёй мэтай паразіць абараняльныя ўмацаванні і чыгуначныя станцыі паўднёвай Англіі. На гэтыя аб'екты была скінута вялікая колькасць бомб буйнага і сярэдняга калібра.

БЕРЛІН, 10 кастрычніка (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што германскай разведчай авіяцыяй, акрамя тых пажараў, аб якіх ужо паведамлялася, зарэгістравана яшчэ пяць моцных пажараў у Вестмінстэры.

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляецца ў камюніке англійскага міністэрства авіяцыі, англійскія бамбардыроўшчыкі днём 9 кастрычніка зрабілі налёты на нафтаперагонны завод у Гомбурге, скапленне барж на паўночным галандскм канале на поўдзень ад Гельдзера, на чыгуначныя шляхі каля Варэндорфа і Гомбурга, а таксама на аэрадром у Тэкселе. Паміма гэтага, былі зроблены налёты на розныя судны ў Гаўры. Адзін з англійскіх самалётаў не вярнуўся на сваю базу.

У ноч на 10 кастрычніка, негледзячы на неспрыяючыя атмасферныя ўмовы, англійскія самалёты зрабілі многалікія налёты на розныя прамысловыя і ваенныя аб'екты ў Германіі і на акупіраванай ею тэрыторыі. Сярод прамысловых аб'ектаў былі нафтаперагонны завод і завод боепрыпасаў у Кельне, алюмініевы завод у Грэфенбройхе, заводы Крупа ў Эсене і электрасілавая станцыя ў Рэйхсгольцэ. Паміма гэтага, англійскія самалёты бамбардыравалі чыгуначныя вузлы і таварныя склады ў Кельне, Дзюсельдорфе, Везеле, Бруселе і многалікія аэрадромы непрыяцеля. Зроблены таксама налёты на порты, размешчаныя паміж Амстэрдамам і Гаўрам. Самалёты берагавой абароны бамбардыравалі розныя судны, докі і майстэрні ў Брэсце. Адзначаны прамыя пападанні ў непрыяцельскія эсмінцы. Адзін англійскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

Дырэкцыя 32-й беластоцкай ваціннай фабрыкі прэміравала грашыма лепшага майстра-варсоўшчыка М. А. Каманюка, які выконвае норму на 150 процантаў. На здымку: тав. Каманюк за работай.

Фота А. Сапіра.

Да адкрыцця навуковай сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку

12 кастрычніка ў 7 гадзін вечара ў Доме партыйнай асветы ў Беластоку пачне працаваць навуковая сесія Акадэміі навук БССР, прысвечаная першай гадавіне вызвалення заходніх абласцей Беларусі ад іга польскіх паноў і капіталістаў.

Правядзенне навуковай сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку мае выключна важнае палітычнае, гаспадарчае і культурнае значэнне для працоўных заходніх абласцей Беларусі; яно сведчыць аб вялікіх бацькоўскіх клопатах комуністычнай партыі і совецкага ўрада аб вызваленым народзе.

Пры панаванні польскіх паноў і капіталістаў на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі ніякіх навуковых работ не вялося. Польскі фашысцкі ўрад выдаткоўваў сродкі на будаўніцтва турмаў, касцёлаў, на шпіёнскую работу, але не на развіццё гаспадаркі, навукі і культуры. Незадачлівыя кіраўнікі былой польскай дзяржавы зусім не цікавіліся багатымі залежамі недраў зямлі. Яны ведалі адно: жорстка эксплаатаваць народ, не даваць яму свабодна мысліць, спусташаць багатыя землі.

Гераічная Чырвоная Армія год таму назад прагнала польскіх паноў і капіталістаў і вызваліла народ ад лютай эксплаатацыі і панавання невуцтва. За год існавання совецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі праведзена вялікая навуковая работа. Акадэміяй навук БССР былі вылучаны і працавалі ў розных раёнах рад навукова-даследчых экспедыцый. Знойдзены залежы каштоўных парод гліны, крэйды і т. д. Вядуцца работы па адшуканню залежаў нафты і даследванню тарфяных багаццяў. Значная работа праароблена этнаграфічна-фальклорнай экспедыцыяй па збору фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў, асабліва ў Пінскай вобласці. Інстытут соцыялістычнай сельскай гаспадаркі пры Акадэміі навук прыступіў да складання вялікай глебавай карты заходніх абласцей Беларусі. Карта будзе закончана ў 1941 годзе.

Супрацоўнік рэдакцыі «Вольная праца» учора гутарыў з прыбыўшым у Беласток вучоным сакратаром прэзідыума Акадэміі навук БССР тав. Д. І. Горыным. Тав. Горын расказаў у гутарцы аб прадстаячай рабоце навуковай сесіі ў Беластоку. На пасяджэннях сесіі 12, 13 і 14 кастрычніка акадэмікамі, прафесарамі і навуковымі работнікамі будзе прачытана 10 дакладаў на розныя тэмы. Прэзідэнт Акадэміі навук БССР акадэмік К. В. Горэў прачытае даклад «Гадавіна вызвалення Заходняй Беларусі», акадэмік В. І. Пічэта — «Беларускі народ у барацьбе за сваё вызваленне», акадэмік С. Я. Вальфсон — «Навука сталінскай эпохі», прафесар А. Г. Ракаў — «Першыя вынікі ўздыму гаспадарчага і культурнага ўзроўню заходніх абласцей БССР і задачы эканамічнага вывучэння гэтых абласцей», акадэмік Н. М. Нікольскі — «Навука і рэлігія», кандыдат філалагічных навук В. В. Барысенка і старшы навуковы работнік Н. Я. Грынблат — «Адлюстраванне ў мастацкай літаратуры і народнай творчасці вызвалення Заходняй Беларусі», акадэмік О. К. Кедраў-Зіхман — «Асноўныя дасягненні ў галіне хімізацыі соцыялістычнага земляробства СССР», акадэмік А. Р. Жэбрак — «Важнейшыя рэзультаты селекцыйна - генетычных работ у СССР», акадэмік Ю. А. Вейс — «Развіццё механізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР» і член-карэспандэнт М. Г. Чыжэўскі— «Вучэнне акадэміка Вільямса аб траваполънай сістэме земляробства».

Акрамя таго, рад папулярных дакладаў і лекцый будзе прачытана на прадпрыемствах горада для рабочых і служачых. Акадэмік А. М. Панкратава прачытае даклад для работніц тэкстыльнай прамысловасці Беластока на тэму «Жанчына ў СССР», Прафесар Герке для работнікаў медыцынскіх устаноў прачытае даклад на тэму «Гістафармакалагічны аналіз адкладвання акрыхіна ў скуры і арганізму чалавека і жывёл».

Для партыйнага, комсамольскага і совецкага актыва горада акадэмік В. І. Пічэта прачытае даклад «Гісторыя беларускага народа», акадэмік Перцаў — «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы», дактарант Акадэміі навук БССР тав. Гутараў — «Жыццё і дзейнасць М. Горкага» і «Паэтычнае майстэрства Владзіміра Маякоўскага», акадэмік Вальфсон — «Інтэлігенцыя і соцыялізм».

Рад лекцый і дакладаў будзе прачытана для чыгуначнікаў Беластока і гарадской інтэлігенцыі.

Каштоўныя рукапісы Івана Франко

ЛЬВОЎ. (ТАСС). Аддзел рукапісаў Львоўскага філіяла бібліятэкі Акадэміі навук УССР набыў рад каштоўных рукапісаў вядомых украінскіх пісьменнікаў. Асаблівую цікавасць прадстаўляе аб'ёмісты сшытак Івана Франка. Гэта зборнік дум і песень і перакладных прац пісьменніка, які адносіцца к таму перыяду, калі дваццацічатырохгадовы Іван Франко, не маючы сродкаў да існавання, займаўся сельскагаспадарчай працай у сяле Нагуевічы. Многія матэрыялы ўпершыню будуць апублікаваны ў 15-м томе юбілейнага выдання твораў пісьменніка.

Набыты таксама рукапісы твораў Лесі Украінкі, пісьмы Капюбінскага, Стэфаніка, Грабоўскага, Кабылянскай, кампазітара Лысенка.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Першыя крокі маладой партарганізацыі

У жніўні гэтага года пры беластоцкім тэкстыльным камбінаце № 6 была створана пярвічная партыйная арганізацыя. З таго часу прайшло толькі два месяцы. Але-ж, не гледзячы на такі кароткі тэрмін, камуністы камбіната правялі вялікую работу.

Члены і кандыдаты партыі, як правіла, паказваюць прыклады ў рабоце. Кандыдат ВКП(б) тав. Хатkoўскі добра працаваў слесарам, потым яго вылучылі механікам. Пад яго кіраўніцтвам праведзен увесь капітальны рамонт камбіната. Зараз тав. Хаткоўскі вылучан на пасаду намесніка дырэктара камбіната. Адначасова ён з'яўляецца членам фабкома, старшынёй бытавой камісіі і агітатарам. Інжынер тав. Астралогава добра наладзіла тэхнічную вучобу рабочых вядучых прафесій. Вучобай яна ахапіла 138 чалавек.

Як належыць пастаўлен партыйны кантроль над дзейнасцю адміністрацыі камбіната. Дрэнна абстаяла, напрыклад, справа з падрыхтоўкай да зімы. Партарганізацыя дэтальна вывучыла гэтае пытанне і вынесла яго на партыйны сход для абмеркавання. Рашэнне партсхода даведзена да рабочых, яно абмяркована на пасяджэнні фабкома і на нарадзе прафсаюзнага актыва. Намечаныя партарганізацыяй мерапрыемствы выкананы поўнасцю. Замест планавых 2 тысяч тон торфу загатоўлена 3 тысячы тон. Для пераабсталявання пячэй завезены ўсе неабходныя матэрыялы, вагатоўлена 150 падвойных рам. На камбінаце дадаткова ўстаноўлены прэс для гатовага тавару, прышыўныя баркі, агароджана 9 бакавых апаратаў. Поўнасцю забяспечана гародніннай сталовая.

Партыйная арганізацыя шырока разгарнула масава-палітычную работу і сур'ёзна займаецца ўсімі пытаннямі работы прадпрыемства, умела выкарыстоўвае права кантроля над дзейнасцю адміністрацыі. Дзякуючы гэтаму, на шостым тэкстыльным камбінаце ў апошнія месяцы прыкметна павышаецца вытворчасць працы, перавыконваецца план. У жніўні план выпуска таварнай прадукцыі выканан на 127 процантаў, у верасні — на 139,4 процанта. План выпуску тканін першага сорту павялічыўся за месяц з 70,2 процанта да 89,3 процанта (замест задання ў 85 проц.). Выраб тавараў трэцяга сорту зніз'ўся больш чым у тры разы. 104 рабочыя і работніцы перавыконваюць свае вытворчыя нормы. Сістэматычна перавыконваюць нормы тт. Кац, Курыльскі, Беластоцкая і многія іншыя.

Такія вынікі, такія першыя крокі работы маладой партыйнай арганізацыі.

А. Маліноўская.
С. Кубышкіна.

Выканаць рашэнні райпартсхода аб прапагандзе і агітацыі

У жніўні на партсходзе Беластоцкага раёна па дакладу сакратара пярвічнай партарганізацыі райвыканкома аб становішчы партыйнай прапаганды і масавай агітацыі было запісана, што сакратар пярвічнай партарганізацыі т. Пятрушэнка мала гутарыць з камуністамі па тэарэтычных пытаннях, не арганізаваў дастаткова кантролю і дапамогі камуністам, самастойна вывучаючым «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

За прайшоўшыя два месяцы пасля райпартсхода можна было многа зрабіць для рэалізацыі гэтай пастановы. Але ні Беластоцкі райком партыі, ні пярвічныя партарганізацыі райвыканкома не задумаліся над тым, што трэба выканаць гэтае рашэнне. Становішча з партыйнай прапагандай і вядзеннем палітмасавай агітацыі нікольki не змянілася.

У апошнія чатыры месяцы зусім ніякай партыйнай работы не праводзілася. У прамежак часу з 29 мая па 30 верасня нават не было партыйных сходаў. Сакратар партарганізацыі тав. Петрушэнка ў выкананне рашэння райпартсхода толькі і зрабіў, што сабраў звесткі, хто які раздзел «Кароткага курса» вывучае. Ніякіх мер па арганізацыі вучобы ён не прыняў. А камуністы тт. Шварцман і Кавалеўскі ўсяго толькі прачыталі па тры раздзелы «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», кандыдат у члены партыі тав. Рыўкаў падручніка нават не браў у рукі.

Не выканана рашэнне райпартсхода па падбору агітатараў і стварэнні працаздольных агіткалектываў. Кіраўнікі агіткалектываў вылучаны толькі фармальна, работы з агітатарамі не вядуць.

У тым, што не выконваюцца рашэнні райпартсхода, у многім вінават Беластоцкі райком партыі, асабліва аддзел прапаганды і агітацыі. Таварышы з аддзела прапаганды і агітацыі райкома забыліся, што мала вынесці рашэнне, галоўнае — трэба арганізаваць выкананне яго.

Работнікі аддзела прапаганды і агітацыі райкома партыі тт. Рак і Брук не дапамагаюць сакратарам пярвічных партыйных арганізацый арганізаваць партыйную вучобу камуністаў, ажыццявіць кантроль, стварыць грамадска - партыйную думку супроць тых, якія не працуюць над сабой, арганізаваць таварыскія субяседванні, абмен вопытам, кансультацыі. Яны не бываюць у партарганізацыях.

У плане работы аддзела прапаганды і агітацыі райкома на верасень былі прадугледжаны правядзенне семінараў кіраўнікоў агіткалектываў, таварыскія субяседванні з камуністамі, кансультацыі. Але ўсё гэта засталося на паперы. Аддзел прапаганды і агітацыі не ведае сапраўднага становішча партыйнай прапаганды і агітацыі ў пярвічных партыйных арганізацыях.

М. Маркевіч,
інструктар Беластоцкага абкома партыі.

Група дэлегатаў XIV з'езда ЛКСМБ ад Беластоцкай вобласці.
Першы рад (злева направа): М. І Вульфін — сакратар абкома, П. І. Міхайлін — памочнік начальніка палітаддзела Беластоцкай чыгункі, А. В. Філатава —сакратар абкома, А. Б. Розенфельд (Н-ская часць Заходняй асобай ваеннай акругі). У другім радзе: В. І. Бутусаў (упраўленне Народнага камісарыята ўнутраных спраў па Беластоцкай вобласці), А. С. Хадзякова (ЦК ВЛКСМ) і С. Н. Заяц (Лапскі райком камсамола).
Фота І .Шышко. Фотахроніка БелТА.

Партарганізацыі растлумачваюць масам значэнне Ўказа аб працоўных рэзервах

(*Хроніка*)

ЦЭХАНАВЕЦ

Райком партыі і ўсе пярвічныя партыйныя арганізацыі ўдзяляюць вялікую ўвагу пытанням па растлумачэнню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб працоўных рэзервах. Усюды праводзяцца партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя сходы. Для дапамогі ў правядзенні масава-растлумачальнай работы паслана ў сельсоветы 10 камуністаў—раённых работнікаў.

Пры выключным уздыме адбыліся сходы ў прамысловых арцелях раёна. Рабочыя і служачыя арцелей, як і ўсе працоўныя, сустрэлі Указ з вялікай радасцю.

ГРОДНА

На прадпрыемствах горада з неаслабнай актыўнасцю праходзяць мітынгі і сходы працоўных. На мітынгу рабочых і служачых шклозавода прысутнічала 190 чалавек, на абутковай фабрыцы—120 чалавек. Стаханавец абутковай фабрыкі тав. Гурэвіч у сваім выступленні сказаў:

— Ні ў адной краіне дзяржава не клапоціцца так аб выхаванні моладзі, як у нашай совецкай краіне. Толькі ў Совецкім Саюзе, па-сапраўднаму клапоцяцца аб выхаванні моладзі, аб падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых. За кошт дзяржавы наша моладзь атрымлівае рамясло і спецыяльнасць. Такога шчасця не мае, і не можа мець моладзь ні ў адной капіталістычнай краіне.

ВАЎКАВЫСК

Пытанні, звязаныя з Указам аб працоўных рэзервах, абмеркаваны на пасяджэнні бюро РК КП(б)Б. Партыйныя сходы ў сувязі з Указам праведзены ва ўсіх пярвічных арганізацыях. Па школах праводзяцца нарады і сходы бацькоў.

БЕЛЬСК

Адразу пасля апублікавання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб працоўных рэзервах райком партыі мабілізаваў увесь актыў раёна на правядзенне масава-растлумачальнай работы. Адбылася нарада раённага партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыва, на якой намечаны мерапрыемствы па прапагандзе Ўказа. На праведзеных актывам сходах у вёсках удзельнічала 355 чалавек. Працоўныя раёна аднадушна адабраюць Указ.

ЗАБЛУДАВА

Пры РК КП(б)Б праведзена раённая нарада сакратароў пярвічных партыйных арганізацый сумесна з партыйным, камсамольскім і прафсаюзным актывам. Прысутнічала 50 чалавек. Пасля нарады ўсе актывісты раз'ехаліся па вёсках для правядзення масава-растлумачальнай работы.

АЎГУСТОЎ

Райком партыі правёў гарадскую нараду настаўнікаў. У ёй удзельнічала 70 чалавек. Настаўнікі аднадушна адобрылі Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і ўзялі на сябе абавязацельства разгарнуць растлумачальную работу сярод бацькоў навучаючыхся.

На нарадзе сакратароў пярвічных партарганізацый гаварылася аб практычных мерапрыемствах па выкананню Ўказа. У Аўгустове мяркуецца адкрыццё сталярнай школы фабрычна-заводскага абучэння на 300 чалавек.

САКОЛКА

У райкоме партыі адбылася інструкцыйная нарада партыйна-камсамольскага актыва раёна па пытанню раз'яснення насельніцтву Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР і пастановы Соўнаркома СССР аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Абучэння. Учора раённы партыйна-камсамольскі актыў выехаў у сельскія советы, калгасы і вёскі для правядзення работы па азнаямленню насельніцтва з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастановай Соўнаркома СССР.

У ЦК КП(б)Б і Соўнаркоме БССР

Соўнарком БССР і Цэнтральны камітэт КП(б)Б прынялі пастанову аб падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы ў калгасах і соўгасах БССР. Соўнарком і ЦК КП(б)Б адзначылі наяўнасць сур'ёзных недахопаў у справе падрыхтоўкі да зімовага ўтрымання жывёлы ў калгасах і соўгасах БССР. Так, напрыклад, будаўніцтва жывёлагадоўчых будынкаў праходзіць недапушчальна марудна. План будаўніцтва канюшань выканан усяго толькі на 55 проц., свінарнікаў — 53 проц., аўчарань — 46 процантаў. Рад калгасаў Лельчыцкага, Ельскага, Окцябрскага, Чашніцкага, Лёзненскага і іншых раёнаў зусім не прыступілі да будаўніцтва аўчарань і свінарнікаў.

У многіх калгасах Магілеўскай, Віцебскай, Гомельскай, Палескай і Мінскай абласцей жывёлагадоўчыя будынкі без падлогі, паталкоў, кармушак, вентыляцыі, без дахаў, не ацепленыя і недапушчальна брудныя. Аднак, работы па абсталяванню іх, ацяпленню, ачыстцы і дэзінфекцыі адкладваюцца на апошнюю чаргу.

Кіраўнікі раённых арганізацый Барысаўскага, Кіраўскага і іншых раёнаў у чаканні цэнтралізаванага завозу нехапаючых будаўнічых матэрыялаў не прымаюць ніякіх мер, каб знайсці іх на месцы, зрываючы такім чынам своечасовую падрыхтоўку жывёлагадоўчых памяшканняў да зімовага ўтрымання жывёлы.

У многіх раёнах, асабліва у тых, дзе рабілася ссяленне хутараў і дзе створаны новыя калгасныя цэнтры, жывёла не забяспечана на зімовы час вадапоем, а мер к таму, каб пабудаваць дастатковую колькасць калодзежаў, не прымаецца. Некаторыя старшыні калгасаў у гэтай справе праяўляюць злачынную бесклапотнасць.

Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б адзначылі зусім недапушчальным тое, што ў радзе калгасаў пры наяўнасці недахопу грубых і сакавітых кармоў для грамадскай жывёлагадоўлі і жывёлы калгаснікаў, не прымаюцца меры да іх накаплення і разам з тым дапускаецца безгаспадарчае скарыстанне кармоў, крадзеж і псаванне іх пры захаванні. Многія калгасы таксама не выконваюць пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб загатоўцы сухога торфу для падсцілу жывёле.

Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б абавязалі Наркамзем і Наркомсоўгасаў БССР, абкомы, райкомы партыі, выканкомы Советаў дэпутатаў працоўных, зямельныя органы на месцах, сельскія советы і праўленні калгасаў ва ўсіх калгасах і соўгасах праверыць становішча жывёлагадоўчых ферм, ход будаўніцтва, рамонту, абсталявання і ацяплення памяшканняў для жывёлы, якасць кармоў і іх захаванне, арганізацыю і правільнасць аплаты працы на фермах. Вынікі праверкі абмеркаваць на сходах калгаснікаў і сельскіх советаў з зацвярджэннем канкрэтных мерапрыемстваў па адхіленню недахопаў у падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы. У кожным калгасе таксама скарыстаць работнікаў жывёлагадоўлі на рабоце па ацяпленню і абсталяванню жывёлагадоўчых будынкаў.

Не пазней 20 кастрычніка вытварыць ачыстку ўсіх жывёлагадоўчых будынкаў, іх дэзінфекцыю і пабелку; арганізаваць прыёмку гатоўнасці жывёлагадоўчых будынкаў да зімоўкі жывёлы камісіяй у складзе старшыні сельсовета, участковага заатэхніка, старшыні калгаса, загадчыка фермай і старшыні рэвізійнай камісіі калгаса.

Перад пастаноўкай жывёлы на стойлавае ўтрыманне абавязкова правесці ў кожным калгасе і соўгасе ветэрынарна-заатэхнічны агляд усяго пагалоўя жывёлы, вылучыўшы для хворай жывёлы асобныя ізаліраваныя памяшканні, абслугоўваючы персанал для індывідуальнага догляду і кармлення да поўнага выздараўлення.

У гаспадарках, дзе маюцца інфекцыйныя захворванні жывёлы, павінны быць распрацаваны на асенне-зімовы перыяд спецыяльныя мерапрыемствы па догляду, утрыманню і аздараўленню пагалоўя жывёлы і зацверджаны асобна па кожнаму калгасу і соўгасу выканкомам райсовета дэпутатаў працоўных не пазней 15 кастрычніка 1940 года.

Забяспечыць значнае перавыкананне плана сенакашэння другога ўкосу кожным калгасам і соўгасам. Устанавіць строгі ўчот наяўнасці кармоў і правільнае скармліванне іх, не дапускаючы разбазарвання і псавання пры захаванні. Неадкладна арганізаваць загатоўку сухога торфу для падсцілкі жывёле.

Да 1 лістапада 1940 года забяспечыць будаўніцтва і рамонт калодзежаў і водасховішч з тым, каб поўнасцю забяспечыць вадапоем грамадскую жывёлу і жывёлу калгаснікаў.

Соўнарком і ЦК КП(б)Б папярэдзілі старшынь калгасаў аб іх асабістай адказнасці за забеспячэнне жывёлы на зіму вадапоем. Замацаваць за жывёлагадоўчымі фермамі пастаянны склад калгаснікаў у адпаведнасці з статутам сельскагаспадарчай арцелі. Устанавіць строгі кантроль за абавязковым стварэннем у кожным калгасе пасля выканання ўсіх абавязацельстваў перад дзяржавай устаноўленыя рашэннем СНК СССР і ЦК ВКП(б) страхавыя фуражныя фонды.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б папярэдзілі партыйныя, совецкія і зямельныя органы аб недапушчальнасці паўтарэння памылак мінулага года, калі ў некаторых калгасах жывёла на зіму засталася без ацепленых будынкаў і дастатковай колькасці кармоў і патрабавалі прыняць усе неабходныя меры да поўнага забеспячэння грамадскай жывёлы калгасаў і соўгасаў цёплымі, абсталяванымі памяшканнямі на зіму і дастатковай колькасцю кармоў.

У бюджэт соцыялістычнай дзяржавы

Працоўныя Беластоцкай вобласці актыўна і на высокім палітычным узроўні правялі падпіску на пазыку трэцяй пяцігодкі (выпуск трэцяга года). Яны далі ў бюджэт дзяржавы 47 мільёнаў 198 тысяч рублёў. Сярод рабочых і служачых рэалізавана пазыкі на суму 40 мільёнаў 876 тысяч рублёў, сярод сельскага насельніцтва — 6 мільёнаў 322 тысячы, што складае да праектуемай сумы бюджэта вобласці 141,9 процанта.

Асабліва дружна прайшла падпіска на пазыку сярод сялян-аднаасобнікаў і калгаснікаў у Граеўскім, Ломжынскім, Едвабнаўскім, Замбраўскім, Чыжаўскім і Бранскім раёнах. Зараз па вобласці паступіла ўзносаў на пазыку па арганізаванаму сектару 11 мільёнаў 752 тысячы рублёў і ад сельскага насельніцтва — 4 мільёны 813 тысяч рублёў. Усяго 16 мільёнаў 565 тысяч рублёў, або 164,3 процанта да плана трэцяга квартала.

Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі датэрмінова ўносяць грошы ў лік падпіскі. Поўнасцю ўнесена падпіска на пазыку па вёсках у Скідэльскім раёне. Кольнаўскі раён сабраў узносаў на пазыку па вёсцы да агульнай гадавой падпіскі 97,8 процанта, Чыжэўскі — 94,8 процанта, Свіслацкі — 95,9 процанта, Ломжынскі — 92 проценты. Па вобласці ўнесена ўзносаў па падпісцы сельскім насельніцтвам 76,1 процанта да агульнай сумы падпіскі.

Ашчадныя касы таксама дабіліся прыліву ўкладаў у суме 4 мільёны 256 тысяч, у тым ліку за трэці квартал 2 мільёны 112 тысяч рублёў. Усяго ў ашчадныя касы вобласці па пазыцы і ўкладах прыцягнута сродкаў у суме 20 мільёнаў 821 тысяча рублёў.

А. Лобаў,
начальнік абласнога Ўпраўлення ашчадкас і дзяржкрэдыту.

Поспехі фінработнікаў Бельскага раёна

Бельскі раён выканаў фінансавы план трэцяга квартала гэтага года на 202 процанты, у тым ліку квартальнае заданне па сельскагаспадарчаму падатку выканана на 284 процанты.

Такіх поспехаў мы дабіліся дзякуючы соцыялістычнаму спаборніцтву з Бранскім раёнам. Работнікі фінаддзела і сельсоветаў арганізавалі вакол сябе фінансавы актыў, які штодзённа праводзіць масавую работу з насельніцтвам. Падатковыя агенты таксама спаборнічалі паміж сабою за датэрміновае выкананне фінплана. Падатковы агент па Аўгустоўскаму сельсовету тав. Мамотка дабіўся датэрміновага выканання квартальнага задання па сельскагаспадарчаму падатку на 200 процантаў. Падатковы агент па Райскаму сельсовету тав. Нічыпарук выканаў свой план на 204 процанты.

Старшыня Райскага сельсовета тав. Кучко арганізаваў фінансавы актыў на паспяховае выкананне фінансавага плана. Сельсовет па праву займае перадавое месца ў раёне.

Чацверты квартал 1940 года з'яўляецца рашаючым у выкананні гадавога фінансавага плана. Гэта абавязвае ўсіх фінансавых работнікаў і фінансавы актыў горада і вёскі з першых-жа дзён забяспечыць такую работу, каб план чацвертага квартала, як і трэцяга квартала, быў поўнасцю і датэрмінова выканан.

Дзюба.

НАША РАДЗІМА

Малдаўская ССР

Увосень мінулага года ў сям'ю совецкіх народаў увайшло 13 мільёнаў грамадзян Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, вызваленых Чырвонай Арміяй ад ігa польскіх памешчыкаў і капіталістаў. У канцы чэрвеня 1940 года Чырвоная Армія вызваліла 3 мільёны 700 тысяч грамадзян Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Нядаўна з дапамогай Совецкага Саюза народы Прыбалтыкі сумелі звергнуць ненавісныя капіталістычна-памешчыцкія ўрады і ўстанавіць совецкую ўладу ў Літве, Латвіі і Эстоніі. Такім чынам, яшчэ 5 мільёнаў 950 тысяч чалавек уступіла ў лік грамадзян многамільённага Совецкага Саюза.

* * *

У лютым 1918 года, скарыстаўшы ваенную слабасць маладой Совецкай рэспублікі, румынская ваеншчына нагла захапіла Бесарабію і адарвала яе ад нашай радзімы. Совецкі ўрад ніколі не прызнаваў гэтага грубага захопніцкага акта, за якім стаялі сілы англа-французскага імперыялізма.

Мы ведалі, прыдзе час, краіна наша ўмацуецца, і тады Бесарабія будзе з'еднана са сваёй мацер'ю-радзімай. Гэты час настаў. У канцы чэрвеня совецкі ўрад прапанаваў Румыніі ў чатырохдзённы тэрмін ачысціць Бесарабію і перадаць таксама СССР паўночную частку Букавіны, насельніцтва якой складаецца пераважна з украінцаў.

Прапанова совецкага ўрада была выканана.

Бесарабія і паўночная частка Букавіны сталі свабоднымі! Назаўсёды скінута ярмо румынскіх баяр, ярмо памешчыкаў і капіталістаў, душыўшых і прыгнятаўшых працоўны народ.

Сёмая сесія Вярхоўнага Совета СССР, ідучы насустрач пажаданням працоўных Бесарабіі і працоўных Малдаўскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі аб з'еднанні малдаўскага насельніцтва Бесарабіі з малдаўскім насельніцтвам Малдаўскай АССР і кіруючыся совецкім прынцыпам свабоднага развіцця нацыянальнасцей, пастанавіла ўтварыць Малдаўскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку — трынаццатую саюзную рэспубліку СССР. Адначасова сесія Вярхоўнага Совета СССР прыняла закон, згодна якому паўночная частка Букавіны і Хоцінскі, Акерманскі і Ізмаільскі паветы Бесарабіі, населеныя пераважна ўкраінцамі, уключаны ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

У саюзную Малдаўскую ССР увайшлі горад Тыраспаль і шэсць раёнаў Малдаўскай Аўтаномнай ССР, горад Кішынёў і шэсць паветаў Бесарабіі.

За годы сталінскіх пяцігодак у Малдаўскай АССР пабудаваны 3 вялікіх кансервавых і 8 вінаробчых заводаў, створана прамысловасць дрэваапрацоўчая, скураная, швейная, каўровая. У рэспубліцы зараз 52 электрычных станцыі. Лік буйных прадпрыемстваў у Малдавіі даходзіць да 235, штогодная прадукцыя якіх ацэньваецца ў 80 мільёнаў рублёў. 99 процантаў сялянскіх гаспадарак Малдаўскай АССР аб'еднаны ў калгасах. 27 МТС абслугоўваюць калгасы трактарамі, камбайнамі і іншымі машынамі. Ураджайнасць калгасных палёў вырасла больш чым удвая. Велізарных поспехаў дасягнула і культурнае будаўніцтва ў Малдаўскай АССР. Тэатры, школы, кіно, клубы, рознага роду курсы і т. д. далучылі масы малдаўскага насельніцтва да культуры і ведаў.

Зусім інакш абстаяла справа ў Бесарабіі.

Румінская ваеншчына давяла гаспадарку Бесарабіі да поўнага заняпаду. Шматлікія прадпрыемствы харчовай прамысловасці працавалі ў апошні час ледзь на чвэрць сваёй магутнасці. Большасць цукровых і піваватрных заводаў была закрыта. Некаторыя прадпрыемствы былі разбураны і вывезены румынамі ў Румынію. Лік беспрацоўных і бяздомных павялічваўся з месяца ў месяц.

Сялянства бязлітасна аграблялася памешчыкамі, кулакамі, чыноўнікамі румынскага каралеўства. Бедпякі і серадпякі складалі ў бесарабскай вёсцы 95 процантаў сялянскіх гаспадарак, але больш паловы ўсіх зямель знаходзілася ў руках памешчыкаў, кулакоў, манастыроў.

Не раз бесарабскі народ паўставаў супроць крывавых захватчыкаў. Паўстанні жорстка падаўляліся акупантамі: тысячы людзей былі расстраляны і замучаны ў румынскіх засценках.

І вось магутная Чырвоная Армія з іменем вялікага Сталіна прыйшла ў Бесарабію і паўночную частку Букавіны — і сотні тысяч, мільёны людзей, шчаслівых і радасных, з'еднаны з совецкім народам.

Многае прадстаіць прарабіць, каб Бесарабія дагнала ў гаспадарчым і культурным развіцці астатнія раёны Малдаўскай ССР. Працоўныя Бесарабіі зробяць гэта. Парукай таму — гарачае жаданне працоўных Бесарабіі жыць і змагацца пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі на дабро соцыялістычнай дзяржавы. На пасяджэнні сесіі Вярхоўнага Совета СССР прадстаўнік дэлегацыі ад працоўных Бесарабіі старая настаўніца тав. Крэчунеску сказала: «Ад імені мільёнаў вызваленых людзей запэўніваем Вас, таварышы дэпутаты, што мы хутка навучымся жыць па-совецку, працаваць — па-стаханаўску, абараняць сваю волю, набытае шчасце — па-сталінску».

З дапамогай усяго совецкага народа, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна Малдаўская ССР сумее выйсці ў рады перадавых рэспублік вялікага СССР.

Адам Міцкевіч

Да 85-годдзя з дня смерці

У артыкуле аб Талстым В. І. Ленін сказаў: «Калі мы маем перад сабою сапраўды вялікага мастака, то хоць некаторыя з найбольш істотных з'яў рэвалюцыі павінны знайсці адлюстраванне ў яго творах». У гэтых словах Леніна заключан глыбокі аналіз літаратурнай творчасці наогул і мастацкай годнасці пісьменніка ў прыватнасці. Зразумела, што з такога пункту гледжання буржуазная літаратурная крытыка не ацэньвала ні аднаго мастака, а польская навука аб літаратуры, верна служачы пануючаму класу, усякімі спосабамі старалася выхаласціць кожнага сапраўды вялікага пісьменніка. Пры гэтым яна не толькі не заўважала ў яго творчасці адлюстравання істотных грамадскіх пераломаў і з'яў рэвалюцыі, але папросту сказажала ідэйны вобраз найбольш адважных бунтароў і барацьбітоў за справу народа. Не інакш паступілі і з Адамам Міцкевічам. У школах, у друку, у навуковых і афіцыяльных выказваннях яго ацэньвалі, як духоўнага бацьку ваяўнічага нацыяналізма. Гаварылі, нібы ён, Міцкевіч, апраўдваў сваёю творчасцю і дзейнасцю ўсю сістэму грамадска-палітычнага гнёту, характэрную для даверсальскай і версальскай Польшчы.

Пануючыя класы імкнуліся выкарыстаць Міцкевіча, як зброю ў барацьбе з рэвалюцыяй, а прагрэсіўна-дэмакратычныя і нават рэвалюцыйныя погляды песняра прадстаўлялі як выбрыкі малакасоса або як прадукт часовага зацямнення розуму.

Цяпер мы можам садраць увесь бруд, якім пакрыла геніяльных твар цоў польская буржуазная навука, можам праўдзіва ацаніць і адчуць веліч Міцкевіча, як мастака і чалавека.

Адам Міцкевіч быў сынам Навагрудскай зямлі. Нарадзіўся ён у 1798 годзе ў Навагрудку, у абяднелай дробнашляхецкай сям'і. Бацька яго быў скромным адвакатам. Рана страціўшы бацьку, Адам Міцкевіч вымушан быў ужо вучнем зарабляць на жыццё прыватнымі ўрокамі. Навакол роднага горада былі раскіданы вёскі беларускіх сялян, якія жылі ў жудаснай прыгоннай няволі. Малады Адам з дзяцінства быў сярод прапоўнага люду, прыглядзеўся да яго нястачы і прыніжэння, сэрцам прыпаў да яго песень, казак і легенд. Міцкевіч сам даволі нацярпеўся бяды. Нічога дзіўнага, што ў яго розуме даспявае бунт супроць уціску і эксплаатацыі чалавека чалавекам. Навагрудчына і Віленшчына да канца XVIII стагоддзя былі месцам значных грамадскіх зрухаў. Хутка бяднела дробная шляхта. Усё больш паглыблялася бяздонне паміж уласнікамі маленькіх дваркоў і магнатамі. Зразумела, што дробная шляхта стала соцыяльнай базай для плывучых з Захаду асветніцкіх ідэй Вялікай Французскай рэвалюцыі. Асяроддзем прагрэсіўна-дэмакратычнага руху на гэтых землях стала ў пачатку XIX стагоддзя Вільна. Тут адбывалася зацятая барацьба паміж рэакцыянерамі і прагрэсіўнымі элементамі. Як студэнт Віленскага універсітэта, Міцкевіч прымае жывы ўдзел у грамадска-асветніцкай рабоце створанага тады тайнага таварыства філаматаў (аматараў навукі). Ён далучаецца да прагрэсіўна-дэмакратычнага лагера, марыць аб новым свеце, які-б грунтаваўся на брацтве і чалавечнасці. З усёй энергіяй ён ненавідзіць акружаючы яго свет самалюбцаў і эксплаататараў.

Юнацкая творчасць Міцкевіча адлюстроўвае шуканні новага зместу жыцця, які быў-бы па тусту не панічам, а перадавой частцы тагочаснай студэнцкай моладзі. Малады Міцкевіч злосна высмейвае каталіцкі клір, не шкадуе і рэлігійных дагматаў (у паэме «Картофля»). Ён выклікае на барацьбу стары парадак. Ва ўрачыстай «Одзе да маладосці» ён заклікае моладзь зрынуць свет гвалту і эгаізма і стварыць прыгожы свет, у якім не будзе хлусні і ўціску. «Ва ўсеагульным шчасці —мэты ўсіх», усклікае ў благародным натхненні малады паэт. У «Одзе да маладосці» моцна гучаць водгукі ідэй Французскай рэвалюцыі. Гэтым гімнам у чэсць інтэрнацыяналізма Міцкевіч стаў духоўным правадыром свайго пакалення.

Любоўная трагедыя на кароткі час адарвала паэта ад грамадскіх ідэй. Ім апанавала пачуццё адзіноцтва. Аднак хутка ён перамог сябе. Дэмакратычныя перакананні, прывязанасць да народа і яго творчасці, а таксама непрыхільнасць да арыстакратычнага мастацтва выклікалі паварот да новага літаратурнага кірунку—да рамантызма.

У «Баладах» адлюстравана харэство аколіц Навагрудка. Ачараваны прыгожасцю песень польскага і беларускага народаў, Міцкевіч піша такія балады на народныя матывы, як «Рыбка», «Свіцязь», «Свіцязянка», «Пані Твардоўская». Новай мелодычнай формай гэтых вершаў паэт аб'яўляе барацьбу літаратуры арыстакратычных салонаў. Моцна гучыць дзе-ні-дзе народная крыўда, як, напрыклад, у «Рыбцы», дзе лютага пана сустракае заслужаная кара за гвалт над прыгоннай дзяўчынай. Харэство народнай фантазіі наймацней чаруе чытача ў міцкевічаўскіх «Дзядах» (частка другая). Сабраўшыся ў капліцы на могілках, беларускі народ выказвае глыбокую жыццёвую праўду, замілаванне да слабых і нянавісць да прыгнятальнікаў. Страшэнны прыгонны ўціск у фантастычнай форме «Дзядоў» знайшоў сваё паэтычнае адлюстраванне.

У 1847 годзе ў пісьме да Александра Ходзькі Міцкевіч пісаў аб беларускім народзе: «З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць сяляне губерні Пінскай, а часткова Мінскай і Гродненскай, захавалі найбольш славянства. У іх казках і песнях ёсць усё. Пісаных памятак мала, толькі Літоўскі Статут напісан іх мовай, найбольш гарманічнай і найменш скажонай з усіх славянскіх дыялектаў. Усё іх жыццё ў душы. Прайшлі на зямлі ўсю гісторыю ў жудаснай нястачы і ўціску. Нават зямля, на якой жывуць, бедная, сухая, бясплодная, пяскі ці багна».

Спакойнае жыццё маладога Міцкевіча было раптам перарвана. Яго арыштавалі за прыналежнасць да тайнага студэнцкага таварыства і прыгаворам царскага суда саслалі ўглыб Расіі. Турма загартавала маладога паэта, навучыла яго мацней сціскаць кулакі супроць дэспатызма. У Расіі, у Пецярбургу і Маскве, Міцкевіч пазнаў сардэчны прыём з боку перадавой часткі рускага грамадства. Ён уступіў у блізкую дружбу з дзекабрыстамі, якія рыхтаваліся да паўстання супроць цара. Найбліжэйшыя адносіны злучалі яго з перадавымі прадстаўнікамі гэтага руху—Рылеевым і Бестужавым. Усім сэрцам Міцкевіч на іх баку. Неўзабаве ён з жудасцю даведваецца аб паражэнні сваіх таварышоў. Страшэнны лёс, які сустрэў Рылеева і Бестужава, кінуў яго ў роспач. У гэтай дэпрэсіі яго выратоўвае моцная воля і новая прыгожая дружба з Пушкіным, найвялікшым рускім паэтам. Глыбокая ўзаемная пашана і любоў падымалі ў абодвух дух, ва ўзаемным абмене пачуццяў мацнеў і харашэў талент Міцкевіча. У Расіі ён напісаў «Крымскія санеты» на фоне падарожжа па Крыме. Небывалае харэство мовы, багацце вобразаў і глыбіня пачуццяў робяць гэтыя вершы, як і пазней напісаны верш «Фарыс», перламі польскай паэзіі.

Песімістычны настрой пасля паражэння дзекабрыстаў гучыць у паэме «Конрад Валенрод». Часова Міцкевіча пакідае здаровы аптымізм. Ён траціць веру ў магчымасць звяржэння дэспатызма ў адкрытай барацьбе. У «Канрадзе Валенродзе» ён апісвае геройства чалавека, які з замілавання да ўласнага народа пушчаецца на забойствы з-за вугла. Міцкевіч не хваліць учынкаў свайго героя. Сам ён нібы вагаецца. Гэта высоўванне праблемы індывідуальнага тэрору—праява духоўнага расстройства, якое, між іншым, неўзабаве знікае.

Па выездзе з Расіі (1829 г.) пачынаецца новы перыяд у жыцці паэта, перыяд блукання па свеце. У Рыме, дзе ён апынуўся ў 1830 годзе, ён трапляе пад уплыў каталіцызма, траціць веру ў магчымасць хуткага звяржэння царскага дэспатызма. Ён шукае ўцехі ў рэлігійным містыцызму. Каталіцызм духоўна аслабіў Міцкавіча, прывіў яму ідэю пасіўнага падпарадкавання лёсу і цярпенне. Таму, калі ў Рыме дайшла да яго вестка аб выбуху ў Польшчы лістападаўскага паўстання, ён не знайшоў у сабе сілы, каб зараз-жа пакінуць Італію і прыняць удзел у барацьбе за волю свайго народа. Перамагчы духоўнае расстройства дапамог яму рускі, прыяцель з часоў яго прабывання ў Маскве, Сяргей Сабалеўскі. Аднак паэту не ўдалося перайсці граніцу. Паўстанне хутка было задушана і з таго часу паэт—пастаянны эмігрант.

Свой боль з прычыны паражэння паўстання Міцкевіч выказаў у магутнай драме «Дзяды дрэздэнскія», у якой ён успамінае тыя часы, калі і яго ў 1824 годзе сустрэлі рэпрэсіі з боку царскага ўрада. «Дзяды дрэздэнскія» з'яўляюцца грымотным бунтам супроць дэспатычнага цара, які не шкадаваў ні жанчын, ні дзяцей, бязлітасна душыў усялякую спробу пратэсту. Палкім абвінавачаннем падточваў Міцкевіч царскую крэпасць рэакцыі, выкрываў грубую царскую бюракратыю, яе паплечнікаў—гнілую і прадажную польскую арыстакратыю.

Міцкевіч не абвінавачвае рускі народ, бо ведае, што ён церпіць няволю. У прыгожай «Імправізацыі» у грымотных словах выражае ён свой бунт супроць бога за тое, што той стварыў зло—няволю. Сілу бунту супроць рэакцыі і ўціску аслабляе містычная ідэя адмаўлення ад барацьбы і пакорнага падпарадкавання мукам. Не гледзячы на гэта, у «Дзядах» пераважае фактар барацьбы з дэспатызмам і гарачае замілаванне воляй, што робіць драму вельмі моцнай.

У шмат яркіх вершах, напісаных у той час, Міцкевіч паказвае ў тоне вострай сатыры нядаўна пакінутую нікалаеўскую Расію. А да рускіх таварышоў звяртаецца сардэчна, з давер'ем:

«Калі да вас здалёк, ад вольных народаў
Аж на поўнач заляцяць гэтыя жаласныя песні
І адзавуцца зверху над краінай ільдоў —
Хай вам звястуюць волю, як жураўлі вясну.

. . . .

Грызе і паліць горыч маёй мовы,
Горыч высcана з крыві і слёз маёй айчыны,
Хай грызе і паліць—не вас, але вашыя аковы».

На парыжскім грунце, дзе прыпынуўся ў 1832 годзе Міцкевіч, ён сустрэўся з не менш лютым ворагам, чымся царскі дэспатызм. Гэтым ворагам быў капіталізм. Міцкевіч з гэтага часу далучаецца да вялікай арміі грамадскіх бунтароў, якія справай і пяром змагаюцца з буржуазным ладам і манархіяй. Пад уплывам новых парыжскіх уражанняў, пад напорам вестак аб задушаных у крыві забастоўках і рабочых дэманстрацыях, прагрэсіўна-дэмакратычныя ідэі Міцкевіча яшчэ больш радыкалізіруюцца. Паэт нязломна верыць, што пабудаваная на эксплаатацыі і ўціску капіталістычная Еўропа хутка ляжа ў руінах, што «з цэлай палітычнай еўрапейскай пабудовы не застанецца каменя на камні». У «Кнігах Пілігрымства», з якіх узяты прыведзеныя тут словы, паэт аб'яўляе рашучую барацьбу «купцам і гандлярам», якія прагнуць золата і пасылаюць грошы на падаўленне свабоды. Ён прадсказвае, што людмолат «з новай моцай наляціць» на дэспатычныя французскі і англійскі ўрады і на ўсіх тых, якія «балбочуць аб вольнасці, а служаць дэспатызму». Аднак у гэтым творы бунт Міцкевіча супроць палітычнага і грамадскага ўціску, прароцтва хуткага развалу капіталістычна-манархічнай Еўропы часам набывае рэлігійна-містычную форму. Але не гэта асноўнае ў творы. Гісторыя ведае многа выпадкаў, калі мары бунтароў прыбіраліся ў рэлігійныя вопраткі. Нарэшце, не мог інакш выказаць свае імкненні ў той час Міцкевіч, які знаходзіўся ў стане дэпрэсіі з прычыны паражэння лістападаўскага паўстання. Калі рэвалюцыйная хваля пералье цца цераз Еўропу ў 1848 годзе, паэт знойдзе да сваіх палітычных ідэй вопратку, зусім свабодную ад рэлігійнай сімволікі, бо рэвалюцыйная ідэалогія дапаможа яму тады вызваліцца ад аслабляючага ўплыву містыцызма. Найважнейшае ў кнігах «Пілігрымства» тое, што сэнсам гісторыі, паводле поглядаў Міцкевіча, ёсць змаганне вольнасці з дэспатызмам. Міцкевіч непахісна верыць, што будучае агульнае брацтва народаў можа быць здзейснена толькі шляхам рэвалюцыі, шляхам агульнай «вайны за свабоду народаў».

Адзінокае блуканне і смутак выгнанніка выклікалі да жыцця найбольшы твор Міцкевіча—«Пан Тадэуш» (1834 г.). Тэма твора—шляхецкая. Шляхта з'яўляецца героем паэмы. Міцкевіч, аднак, падкрэслівае, што гэты свет ужо скончыўся, што гэта «апошнія экземпляры старадаўняй Літвы». Праўда, з гэтым светам як-ніяк было звязана яго дзяцінства, але без жалю расстаецца ён з мінулым, не прагне яго ўваскрэсіць. З эпічным спакоем ён апісвае дадатныя і адмоўныя бакі Яцкаў, суддзяў і Войскіх. З нібы дабрадушным гумарам рысуе разнастайныя тыпы дробнай шляхты. Кожная асоба гаворыць тут сваёй мовай. Мы ўяўляем усіх людзей, як быццам з імі заўсёды жылі. Такія жывыя і пластычныя партрэты міцкевічаўскіх герояў, праўдзівыя і прыгожыя. Шчыры гуманізм і благародны аб'ектывізм паэта знайшлі сваё выражэнне ў сімпатычным паказе рускага Нікіты Рыкава і яўрэя Янкеля. Ідэя брацтва народаў знайшла ў абрысаванні гэтых людзей сваё мастацкае ўвасабленне. Глыбокі рэалізм, вялікае майстэрства ў апісанні пейзажаў, цёплы сардэчны гумар —адбітак душы, мілуючай чалавека — ставяць «Пана Тадэуша» на найвышэйшым узроўні літаратурных твораў свету, побач з эпасам Гомера.

Пасля напісання «Пана Тадэуша» веліч Міцкевіча, галоўным чынам, праяўляецца не ў паэзіі. Узнімаючыйся рэвалюцыйны рух у Еўропе цалкам яго паглынае. На хвалі гэтага руху вырастае Міцкевіч—чалавек, палітычны дзеяч, які служыць не аднаму свайму народу, але ўсім прыгнечаным. Ён раздзяляе лёс многатысячнай арміі палітычных эмігрантаў розных нацыянальнасцей, якія пакінулі свае родныя краіны, каб пазбегнуць рэпрэсій з боку сваіх дэспатычных урадаў. Не тугой аб пакінутым родным краі, а бескампраміснай барацьбой з дэспатызмам рэагіруе Міцкевіч на свой эмігранцкі лёс. Як прафесар славянскай літаратуры ў Парыжы, ён кідае выклік царызму, які задушыў народ і знішчыў яго культуру. У сваіх лекцыях Міцкевіч абараняе народную творчасць, паказвае яе гістарычную вартасць і дзякуючы гэтаму карыстаецца сімпатыяй усёй прагрэсіўна-дэмакратычнай думкі.

Навуковую і палітычную працу Міцкевіча аслабіў і перарваў пагубны ўплыў Андрэя Тавянскага, містыка і сектанта, у духоўную няволю да якога на некаторы час трапіў Міцкевіч. Некалькі год пазней ён адкінуў прэч абцяжарваючае яго ярмо містыцызма і з новымі сіламі прымкнуў да палітычнай барацьбы. Было гэта ў 1848 годзе пасля народнай рэвалюцыі ва Францыі. Уся манархічная Еўропа затраслася тады ў сваіх асновах. Да бою за новы лад, супроць дэспатызма рушылі народныя масы ў Германіі, Аўстрыі і іншых краінах. Еўрапейскія гарады пакрыліся барыкадамі. Пад напорам шырокага народнага руху расслабіліся ланцугі грамадскага і палітычнага прыгнёту. У той перыяд, які называюць «вясной народаў», Міцкевіч перажывае прыток маладой энергіі. У 50-гадовым узросце ён адпраўляецца ў Італію і прыступае да стварэння там польскага легіёна для барацьбы за вольнасць гэтага края. Як інтэрнацыяналіст і вораг дэспатызма, Міцкевіч імкнецца дапамагчы італьянскаму народу дабіцца палітычнай незалежнасці. Гэта было ў адпаведнасці з праграмай «Кніг Пілігрымства» аб агульнай вайне за свабоду народаў. Міцкевіч сам называе свой легіён «рэспубліканскай і соцыялістычнай арміяй». Пабач з барацьбой супроць дэспатызма Міцкевіч ставіць італьянскаму легіёну і канкрэтныя заданні ў Польшчы. «Ізраілю пашана, братэрству роўнае ва ўсім права». Таксама роўнае права і брацтва «кожнаму славяніну, жывучаму ў Польшчы», і «нявесце, таварышцы жыцця».

Магчымасць служэння міжнароднай ідэі братэрства народаў на старонках газет заклікае Міцкевіча ў Парыж, дзе ён засноўвае газету «Трыбуна народаў». Міцкевіч становіцца рэдактарам. Газета мае вялікую групу супрацоўнікаў розных нацыянальнасцей—французаў, італьянцаў, палякаў, рускіх і іншых. Усе яны былі дэмакратамі і соцыялістамі. І Міцкевіч публічна называе сябе соцыялістам. У «Трыбуне народаў» бліснуў небывалы публіцыстычны талент Міцкевіча, рэвалюцыйнага дэмакрата і інтэрнацыяналіста. У некалькіх дзесятках артыкулаў, аб якіх, зразумела, буржуазная навука пісала з выразнай непрыязню, або з пачуццём сораму, Міцкевіч выступае супроць буржуазнай Французскай рэспублікі, абвінавачваючы яе ў здрадзе народным інтарэсам.

Там-сям соцыялізм Міцкевіча выглядаў туманна. Жылі ў яго светапоглядзе рэлігійныя ідэі, але сіла рэвалюцыйных перакананняў Міцкевіча захапляе чытача. Міцкевіч выкрывае капіталізм і без усякай баязні становіцца на бок рабочых. «Французскі народ мае непарушную волю, бязлітасна друзгоча, звяргае дактрыны, якія становяцца наперакор яго паходу»,—грозна перасцерагае капіталістаў Міцкевіч. Сурова асуджае ён ганебную сістэму неўмяшання буржуазнага французскага ўрада, які аддаў на свавольства раз'юшаным аўстрыйскім салдатам італьянцаў, баронячых сваю свабоду, таксама як пад прыкрыццём «неўмяшання» некалькі дзесяткаў год пазней буржуазная Францыя зрабіла ў адносінах да рэвалюцыйнай Іспаніі.

«У рэвалюцыі трэба быць рэвалюцыянерам. Хто ім не з'яўляецца, той падае»,—гаворыць Міцкевіч, рашучы працўнік згодніцтва і цярплівага чакання, як гэта раілі некаторыя соцыялісты таго перыяду. Не спакойным шляхам можна ўвесці соцыялізм, але «пры дапамозе арміі, пры дапамозе салдат». Вялікая часіна, якой чакаў доўгія годы Міцкевіч, прабіла для яго. «Наперад! Яшчэ крок!»,—кліча ён у прыгожай адозве да венграў,—«Аж уся старая Еўропа захістаецца». Верыў Міцкевіч у гэта горача, так, як верылі найлепшыя людзі тых часоў. Верыў, і таму далучыўся да рэвалюцыйнага лагера. Трыумф рэакцыі закрыў «Трыбуну народаў». І зноў пацягнуліся адзінокія дні змучанага жыццёвымі паражэннямі Міцкевіча.

У 1855 годзе, калі выбухнула Крымская вайна, Міцкевіч выехаў у Турцыю, каб стварыць там польскі легіён для барацьбы супроць нікалаеўскай Расіі. Ужо стары, ён хацеў хоць рэшткамі сваіх сіл дапамагчы ў звяржэнні царскага дэспатызма, у вызваленні свайго народа. У Канстантынопалі яго зваліла з ног страшэнная хвароба—халера. 26 лістапада 1855 года не стала найвялікшага паэта польскага народа.

Усё жыццё, як мастак і чалавек, Адам Міцкевіч стаяў наперадзе народа і ўсяго чалавецтва, клікаў на бой з ліцамер'ем і грамадска-палітычным уціскам. Не гледзячы на часовыя хістанні, прыгожымі словамі вёў ён сваё пакаленне наперад. Адам Міцкевіч належаў да «сапраўдных вялікіх мастакоў» у ленінскім разуменні, бо не толькі «адлюстроўваў істотныя з'явы рэвалюцыі ў сваіх творах», але і дапамагаў іх ажыццяўленню. З любоўю да вялікага мастацкага генія, з пашанай да нязломнага рэвалюцыйнага дэмакрата перачытваем мы сёння зноў і зноў паэзію і пісьмы песняра польскага народа. Адам Міцкевіч—агністы бунтар супроць дэспатызма, сейбіт нянавісці да прыгнятальнікаў, абаронца прыгнечаных народаў, пясняр барацьбы за свабоду—становіцца саўдзельнікам нашай новай соцыялістычнай культуры, супольным выхавальцам новага чалавека.

Г. ВОЛЬПЕ.

Стаханаўка-двухстаночніца 32-й беластоцкай вацiннай фабрыкі Л. С. Сіскевіч, якая сістэматычна выконвае норму на 120—130 працантаў. Нядаўна тав. Сіскевіч прынята ў комсамол.
Фота А. Сапіра

Фотахроніка БелТА.

Дастойна падрыхтуемся да святкавання XXIII гадавіны вялікага Кастрычніка

Расце прадукцыйнасць працы

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** На гумова-цясёмачнай фабрыцы шырока разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу свята — XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Калектыў фабрыкі прымае ўсе меры, каб да свята перавыканаць вытворчы план. Рабочыя прад'явілі рахунак граеўскай электрастанцыі, па віне якой фабрыка ў мінулым месяцы мела каля 1000 чалавека-дзён прастою.

Расце прадукцыйнасць працы і лік стаханаўцаў. Уперадзе ідуць Рыша Віленская, Вольф Роджэканскі і Вікенцій Навяліус. Яны сістэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Усе трое ўзнагароджаны наркомам лёгкай прамысловасці СССР значком «Выдатнік лёгкай прамысловасці». Гэтая ўзнагарода выклікала новы вытворчы ўздым на фабрыцы.

—0—

Перавыконваюць план пагрузкі

Сярод работнікаў станцыі Бельск з кожным днём шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва. У выніку спаборніцтва калектыў станцыі дабіўся новых вытворчых поспехаў. План пагрузкі ў верасні станцыя выканала на 128 процантаў. Звыш плана пагружана 27 вагонаў грузаў першай катэгорыі.

Добра арганізаваў работу ў сваёй змене малады вылучэнец, дзяжурны па станцыі тав. Ляшчынскі. Прымяняючы метады скораснай пагрузкі, яго змена 1 кастрычніка за дзяжурства разгрузіла 34 вагоны.

Зараз калектыў станцыі дзейсна рыхтуецца да зімы. У службовых будынках ужо адрамантаваны печы, загатоўлен новы і прыведзен у парадак стары інструмент.

—0—

Беластоцкі кандзіцерска-макаронны камбінат

З сакавіка гэтага года ў Беластоку на аснове былых прыватных прадпрыемстваў (кандзіцерскай і макароннай фабрык і патачнага завода) створан кандзіцерска-макаронны камбінат.

На камбінаце зараз працуе каля 200 чалавек. Значна вырасла ў параўнанні з перыядам перад устанаўленнем совецкай улады колькасць прадукцыі на прадпрыемствах камбіната. На кандзіцерскай фабрыцы выпуск прадукцыі павялічыўся ў 4 разы. Макаронная фабрыка выпускае адну тону прадукцыі ў дзень (пры гаспадару-ж — усяго 480 кілограмаў). Удвая вырасла колькасць прадукцыі патачнага завода.

У бліжэйшым будучым макаронная фабрыка будзе рэканструіравана. Яна дасць ад трох да чатырох тон макарон у суткі.

Сярод работнікаў камбіната нямала стаханаўцаў, якія паказваюць прыклады соцыялістычных адносін да працы. Брыгадзір-карамельшчык тав. Паеўскі сваю норму выконвае на 132 проценты. На 135 працантаў выконвае норму работніца тав. Кароль, 180 працантаў дзённай выпрацоўкі дае тав. Мастоўская.

Для кантролю якасці прадукцыі і яе стандартнасці створана нядаўна пры камбінаце спецыяльная лабараторыя, дзе працуюць тры тэхнолагі-спецыялісты.

У 1941 годзе ў Беластоку ўступіць у строй новая вялікая кандзіцерская фабрыка. На абсталяванне новага прадпрыемства адпушчана 700 тысяч рублёў.

ЗА РУБЯЖОМ

Германскае абвяржэнне

БЕРЛІН, 9 кастрычніка. (ТАСС). На прэс-канферэнцыі ў германскім міністэрстве замежных спраў прадстаўнік міністэрства заявіў, што чуткі, якія распаўсюдзіліся аб пасылцы германскіх войск у Румынію, з'яўляюцца няправільнымі.

У Румынію пасланы толькі германскія афіцэры-інструктары для румынскай арміі і ўзорныя германскія часці, якія маюць вучэбныя мэты.

—0—

ПРАДСТАЎНІК АНГЛІЙСКАГА КАМАНДАВАННЯ АБ ВАЙНЕ Ў АФРЫЦЫ

ЛОНДАН, 9 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, прыбыўшы з Кеніі прадстаўнік камандавання англійскіх паветраных сіл заявіў, што некаторы лік германскіх самалётаў тыпу «Юнкерс-86», якія раней выкарыстоўваліся ў Абісініі ў саставе грамадзянскай авіяцыі, прымяняюцца італьянцамі ў якасці бамбардыроўшчыкаў. Галоўная задача паветраных сіл, якія знаходзяцца ў Паўднёвай Афрыцы, сказаў прадстаўнік камандавання, заключаецца ў тым, каб побач з паветранай разведкай перашкаджаць снабжэнню праціўніка і разбураць яго склады гаручага і прыпасаў. Паўднёва-афрыканскім паветраным сілам прыходзіцца дзейнічаць у цяжкіх прыродных умовах і на абшырным прасторы. Англійскія паветраныя сілы пастаянна атрымліваюць падмацаванні. Сярод прыбыўшых машын ёсць знішчальнікі навейшых тыпаў. Самалёты, якія ёсць у наяўнасці, забяспечаць узаемадзеянне з сухаземнай арміяй і марскім флотам у абароне Егіпта.

—0—

ЭВАКУАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ З БЕРЛІНА

БЕРЛІН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Газета «Нахтаустабе» паведамляе аб працягваючайся эвакуацыі дзяцей з Берліна ў паўднёвыя і паўднёва-ўсходнія раёны Германіі. 8 кастрычніка з аднога раёна Берліна было адпраўлена 750 дзяцей ва ўзросце ад 6 да 10 год. Дзеці адпраўлены ў Сілезію. Газета ўказвае, што эвакуацыя робіцца ў добраахвотным парадку.

—0—

ВЫКЛІК У ЗША АМЕРЫКАНСКАГА ПАВЕРАНАГА Ў СПРАВАХ У БЕРЛІНЕ

НЬЮ-ЙОРК, 10 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс з Вашынгтона, дзяржаўны дэпартамент ЗША заявіў, што амерыканскі павераны ў справах у Берліне Керк выклікан у ЗША для кансультацыі. Керк, адзначае агенцтва, не вернецца ў Берлін.

—«о»—

СУСТРЭЧА КРЭЙГІ З МАЦУОКА

ЛОНДАН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе дыпламатычны аглядальнік агенцтва Рэйтэр, англійскі пасол у Токіо Крэйгі наведаў сёння японскага міністра замежных спраў Мацуока. Тэмай іх гутаркі было англійскае рашэнне адкрыць дарогу Бірма—Кітай.

Зводка германскага камандавання

БЕРЛІН, 9 кастрычніка. (ТАСС). На працягу ўчарашняга дня і ноччу працягваліся дзеянні германскай авіяцыі супроць Лондана і іншых важных пунктаў Англіі. Асабліва моцнымі былі атакі на шматлікія гарады, партовыя і прамысловыя збудаванні, чыгуначныя лініі, а таксама аэрадромы, якія знаходзяцца ў Паўднёвай Англіі. На сямі англійскіх аэрадромах у выніку прамога пападання бомб сярэдняга і буйнага калібра ўдалося знішчыць ангары і сховішчы. Кулямётным агнём была знішчана на зямлі вялікая колькасць непрыяцельскіх самалётаў. У Паўднёвай Англіі аб'ектамі налётаў з'явіліся таксама месца скаплення войск, прамысловыя прадпрыемствы, прадпрыемствы ваеннага снабжэння. У выніку бамбардыроўкі ў розных месцах узніклі моцныя пажары. Бомбы буйнага калібра былі скінуты таксама на партовыя і прамысловыя збудаванні на заходнім узбярэжжы Англіі.

Ля шатландскага ўзбярэжжа германскі разведчы самалёт атакаваў англійскі гандлёвы параход, скінуўшы на яго некалькі бомб. Параход, на якім узнік пажар, пачаў тануць.

У 200 кілометрах ад шатландскага ўзбярэжжа германскі бамбардыроўшчык атакаваў ішоўшы пад моцным канвоем караван суднаў, які складаўся з 5 транспартаў з войскамі. Адно судно танажам у 20 тысяч рэгістравых брута-тон атрымала моцныя пашкоджанні ў выніку пападання ў яго некалькіх бомб і вымушана было спыніць далейшы шлях.

Англійскія самалёты, спрабаўшыя ноччу зрабіць налёт на Германію і занятыя ею вобласці, панеслі вялікія страты ад моцнага абаронча га агню нашай зенітнай артылерыі. Англійскія самалёты бамбардыравалі некаторыя гарады Паўночнай і Паўночна-Заходняй Германіі. Пашкоджана некаторая колькасць дамоў. Некалькі чалавек грамадзянскага насельніцтва забіта. Спробы непрыяцеля зрабіць налёты на прамысловыя і чыгуначныя збудаванні Германіі асталіся беспаспяховымі.

На працягу ўчарашняга дня праціўнік страціў 16 самалётаў, з якіх 12 збіты ў паветраным бою, 4 — зенітнай артылерыяй. 3 германскіх самалёты не вярнуліся на свае базы.

БЕРЛІН, 9 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што мінулай ноччу два германскіх бамбардыроўшчыкі знішчылі англійскі воінскі эшалон. Атрад германскіх самалётаў заўважыў на адным з англійскіх вакзалаў поезд з 20 цыстэрн. Два германскіх самалёты атакавалі яго. У хуткім часе цыстэрны пачалі ўзрывацца адна за другой. Вакзал і яго ваколіцы на працягу некалькіх сот метраў ператварыліся ў суцэльнае мора полымя. Агонь, па ўсёй бачнасці, знішчыў размешчаныя паблізу вакзала склады і іншыя памяшканні таварнай станцыі. Полымя, якое бушавала некалькі гадзін, ахапіла таксама будынкі станцыі і чыгуначнага ўпраўлення.

У другім паведамленні Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў апошнюю ноч на Лондан было скінута звыш 300.000 кілаграмаў бомб. Германскі самалёт «Дорнье-17» знішчыў адну электрастанцыю.

Бамбардыроўка Берліна

ЛОНДАН, 9 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў ноч на 8 кастрычніка першыя англійскія самалёты, якія рабілі налёт на Берлін, паявіліся над сталіцай Германіі на 2 гадзіны раней звычайнага. У 21 гадзіну 20 мінут англійскія самалёты скінулі першыя бомбы на Моабіцкую электрастанцыю, якая знаходзіцца ў 1,5 кілометрах ад будынка рэйхстага. Бамбардыроўка гэтай электрастанцыі рабілася з вышыні 5 тысяч футаў. Амаль на працягу чатырох гадзін англійскія самалёты скідвалі бомбы на ваенныя аб'екты Берліна і яго ваколіц.

У час другога налёту, які пачаўся каля поўначы, некалькі злучэнняў англійскіх самалётаў падверглі бамбардыроўцы ваенныя аб'екты Берліна, не гледзячы на інтэнсіўны агонь вялікай колькасці зенітных батарэй. На аб'ектах, якія падвергліся бамбардыроўцы, адбыліся ўзрывы і ўзніклі пажары.

Адначасова з бамбардыроўкай Берліна другія злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў атакавалі рад пунктаў у Германіі і на акупіраванай ёю тэрыторыі. Асноўнымі аб'ектамі бамбардыровак былі парты на ўзбярэжжы праліва Ла-Манш, пазіцыі германскай дальнабойнай артылерыі на мысе Гры Нэ, авіяцыйныя заводы «Фокер» у Амстэрдаме. Апрача таго, бомбы былі скінуты на лініі камунікацый, у Гаме, Мангейме і Оснабруку. Звыш 20 тон узрыўчатых матэрый было скінута на докі ў Зеебругу, Остэндзе, Дзюнкерку, Кале, Булоні, Д'епе, Гаўры і Ларыане. Асабліва вялікія разбурэнні прычынены докам і складам у Кале, дзе разам з фугаснымі бомбамі былі скінуты тысячы запальваючых бомб. На авіяцыйных заводах «Фокер» таксама ўспыхнуў пажар. Незадоўга да паўночы англійскія самалёты завяршылі бамбардыроўку асноўных чыгуначных шляхоў у Германіі. Бамбардыроўцы падвергліся Гам, Сест, Оснабрук, Мангейм, Эранг і чыгуначны вузел паблізу Кельна.

ЛОНДАН, 9 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае камюніке англійскага міністэрства авіяцыі, у якім гаворыцца, што ў ноч на 8 кастрычніка моцныя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі паспяховы налёт на ваенныя аб'екты ў Берліне. Звыш 100 цяжкіх бомб было скінута на тры электрастанцыі. Падпален таварны склад у Тэмпельгофе. Бамбардыроўцы падвергліся таксама прамысловыя прадпрыемствы.

У Друскеніках адпачыла 4 тысячы чалавек

У жывапіснай мясцовасці, на беразе поўнаводнага Нёмана, размясціўся бальнеалагічны і фізіятэрапеўтычны курорт «Друскенікі». На працягу стагоддзя там лячыліся і адпачывалі памешчыкі і капіталісты, і толькі ў гэтым годзе дзверы пансіянатаў адкрыліся для працоўных.

4 тыс. чалавек правялі сёлета ў «Друскеніках» свой водпуск. Ткачы Беластока, дрэваапрацоўшчыкі Гайнаўкі, чыгуначнікі Брэста, запалачнікі Пінска, рабочыя і інтэлігенцыя Мінска, Масквы, Ленінграда і многіх іншых гарадоў і раёнаў СССР атрымалі неабходнае лячэнне, паправілі сваё здароўе.

На курорце абсталявана паліклініка з лячэннем па ўсіх спецыяльнасцях. Асабліва добра адзываюцца адпачываючыя аб інстытуце фізічных метадаў лячэння, каскадным купанні, бальнеалагічных ваннах і іншыя.

Урачэбную дапамогу адпачываючым аказвалі віднейшыя спецыялісты Беларусі — акадэмік Д. А. Маркаў, заслужаныя дзеячы навукі прафесары Л. Я. Сітэрман, М. Л. Выдрын, прафесары І. М. Ліпец, Б. Н. Цыпкін і др.

15 кастрычніка на курорце заканчваецца першы савецкі сезон. У будучым годзе «Друскенікі» ператворыцца ў адну з лепшых здраўніц Савецкага Саюза. Намечана правесці рэканструкцыю курорта. Сярод зялёных насаджэнняў вырастуць новыя карпусы дамоў адпачынку чыгуначнікаў і ЦК саюза вышэйшай школы. Пачаты падрыхтоўчыя работы да ацяплення будынкаў, што дасць магчымасць перавесці курорт на круглагадовую работу. У сезоне 1941—1942 гг. «Друскенікі» наведае 16—20 тысяч чалавек.

Ідзе падрыхтоўка да набору пастаянных урачэбных кадраў, у прыватнасці, спецыялістаў па бальнеалагічнаму лячэнню.

Конюх калгаса «Кастрычнік» (Прапойскага раёна, Магілеўскай вобласці) М. Е. Дзёмін, звеннявая калгаса «Пуцілавец» (Шклоўскага раёна, Магілеўскай вобласці), дэпутат Вярхоўнага Савета БССР М. К. Бандаркова на курорце Друскенікі.

Фота А. Велікжаніна. Фота ТАСС.

Дом дзіцяці ў Дайлідах (Беластоцкі раён) у былым доме князя Любамірскага.

Фота Б. Вернера. Фотахроніка БелТА.

Год таму назад

(Хроніка падзей)

11 кастрычніка адбыліся першыя перадвыбарчыя сходы, прысвечаныя высоўванню кандыдатаў у дэпутаты Народнага Сабрання. Народ сказаў сваё слова, выразіў сваю волю. Ён даверыў вырашыць лёс вызваленага края сваім лепшым сынам і дачкам. Першымі кандыдатамі былі высунуты тт. Прытыцкі, Турлейскі, Дз'ячук, Машэвіцкі і іншыя. Народ не памыліўся. Гэтыя абраннікі выканалі волю сваіх выбаршчыкаў у Народным сабранні. І народ у другі раз аказаў ім давер'е, выбраўшы іх дэпутатамі ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Перадвыбарчыя сходы праходзілі актыўна і бурна. Дзесяткі людзей выступалі і гаварылі аб сваіх кандыдатах. Як гадзюкі, сядзелі на сходах фабрыканты і іх лакеі—пэпэсаўцы і бундаўцы. Яны толькі ціхонька шыпелі, але не асмельваліся выстаўляць сваіх кандыдатаў. Калі-б хто і асмеліўся навязаць рабочым сваю кандыдатуру, яго проста не сталі-б слухаць, а сагналі-б з трыбуны. Палітычная актыўнасць мас была выключна высокая.

За выбарчай кампаніяй з выключнай цікавасцю сочыць увесь савецкі друк, уся грамадскасць. У Мінску 12 кастрычніка адбыўся сход партыйнага актыва, на якім з дакладам аб Заходняй Беларусі выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка.

Расказаўшы ў заключэнне аб вялікай рабоце, якая зараз разгарнулася ў Заходняй Беларусі ў сувязі з выбарамі ў Народнае Сабранне, тав. Панамарэнка заклікаў партыйны актыў яшчэ больш узмацняць гаспадарчую і культурную дапамогу сваім аднакроўным братам беларусам.

* * *

22 кастрычніка адбыліся выбары дэпутатаў у Народнае Сабранне. 28 кастрычніка адбылося Народнае Сабранне, якое рашыла пытанне аб з'еднанні беларускага народа.

Прайшоў год, як з'едналы беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна будуе сацыялізм. Гэты год быў поўны кіпучай творчай работай. Народ, скінуўшы з сябе ланцугі рабства і эксплаатацыі, творыць на дабро сваёй радзімы.

ЧЭСНАСЦЬ

Супрацоўніца Беластоцкага абласнога гандлёвага аддзела старшы бухгалтар тав. Л. В. Рапапорт, находзячыся ў аперацыйным зале беластоцкага дзяржаўнага банка, заўважыла, што невядомая ёй грамадзянка забыла на стале дамскую сумку. Тав. Рапапорт узяла гэту сумку і перадала адміністрацыі банка. Пры ўскрыцці сумкі ў ёй аказаліся грошы і рад розных дакументаў. Як высветлілася, сумку забыла бухгалтар беластоцкай арцелі «Калектыўная праца» тав. Б. Х. Варат. Сумка з грашыма і іншымі рэчамі звярнута тав. Варат.

ПАВЕДАМЛЕННІ

12 кастрычніка, у дзень адкрыцця навуковай сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку, будуць прачытаны наступныя лекцыі:

1. «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы». Лектар — акадэмік В. Н. Перцаў.

Лекцыя адбудзецца ў актавым зале педінстытута. Уваход па білетах. Білеты прадаюцца ў Доме партасветы і ў канцылярыі педінстытута. Цана білета — 1 рубель. Пачатак у 8 гадзін вечара.

2. «Паходжанне і класавая сутнасць рэлігіі». Чытае лекцыю навуковы сакратар інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР Н. С. Махнач.

Лекцыя адбудзецца ў клубе тэкстыльшчыкаў. Уваход свабодны. Пачатак у 8 г. вечара.

3. «Жыццё і дзейнасць А. М. Горкага». Лектар — дактарант І. В. Гутараў.

Лекцыя адбудзецца ў зале педвучылішча. Уваход вольны. Пачатак у 8 г. вечара.

4. 12 кастрычніка ў 9 гадзін вечара ў педагагічным кабінеце будзе прачытана лекцыя акадэмікам Пічэта на тэму: «Гісторыя беларускага народа».

Беластоцкі Гарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

УБ. — 66. Друкарня Беластокдруку.